«Шчасце — гэта вялікае майстэрства...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Акрамя таго, за высокія творчыя дасягненні і актыўны ўдзел у падрыхтоўцы дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013» падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена артысту-вакалісту (салісту) Маладзёжнага тэатра эстрады Вользе Вронскай, настаўніку танца, кіраўніку вакальна-харэаграфічнай студыі «Максі Брыз» мінскай сярэдняй школы № 202 Ганне Саковіч, намесніку галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 24» Белтэлерадыёкампаніі Вользе Саламаха.

За выдатныя творчыя дасягненні Гранд-прэмія і званне лаўрэата спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі прысуджана салісту эстрадна-вакальнай студыі «Залатыя галасы», бронзаваму прызёру дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013» Ільі Волкаву.

Заахвочвальныя прэміі спецфонду прысуджаны ўдзельнікам дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2013» Кацярыне Арцем'евай, Іаланце Вярбіцкай, Мілене Вольскай, Дзіне Гейдаравай і Лейле Табатадзэ.

ЗАСНАВАНЫ ЮБІЛЕЙНЫ МЕДАЛЬ

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ «Аб устанаўленні юбілейнага медаля «70 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакументам зацверджаны Палажэнне аб юбілейным медалі, яго апісанне і ўзор пасведчання да яго. Гэтым юбілейным медалём будуць узнагароджвацца ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, былыя вязні фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета і іншых месц прымусовага ўтрымання, створаных фашыстамі і іх саюзнікамі ў гады Другой сусветнай вайны.

Акрамя таго, юбілейным медалём плануецца ўзнагароджваць замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія непасрэдна прымалі ўдзел у баявых дзеяннях за вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Медаля таксама будуць удастойвацца ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Беларусі, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, работнікі дзяржорганаў і іншыя асобы, якія ўнеслі значны ўклад у гераіка-патрыятычнае выхаванне грамадзян Беларусі, увекавечанне памяці загінулых, арганізацыю мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

■ Выбары

ПАЗБЕГНУЦЬ РАНЕЙШЫХ ПАМЫЛАК

Самы эфектыўны спосаб — шляхам збору подпісаў

Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў Беларусі 27-га склікання стартавала 12 студзеня і працягнецца па 10 лютага ўключна. Вылучаць кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў маюць права палітычныя партыі, працоўныя калектывы і грамадзяне шляхам збору подпісаў.

Сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай ЛАЗАВІК лічыць, што вылучэнне шляхам збору подпісаў з'яўляецца для кандыдатаў самым эфектыўным спосабам удзелу ў выбарчай кампаніі. Такое меркаванне ён выказаў журналістам у Віцебску падчас семінара па пытаннях арганізацыі, падрыхтоўкі і правядзення выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

Самы лёгкі спосаб вылучэння, сказаў Мікалай Лазавік, — ад палітычных партый. Зарэгістраваная ў вобласці партыя можа вылучыць кандыдатаў па ўсіх 60 округах абласнога Савета дэпутатаў. Працоўны калектыў можа вылучыць толькі аднаго кандыдата, і ў той акрузе, дзе знаходзіцца прадпрыемства.

Самы складаны спосаб — шляхам збору подпісаў. «Подпісаў хоць і няшмат трэба сабраць (у абласны Савет — 150, у раённы — 75, у сельскі і пасялковы — 20), але за імі трэба пахадзіць. Трэба сустрэцца з выбаршчыкамі, і тут могуць быць пэўныя складанасці. Але нараўне з імі ёсць і перавагі. Справа ў тым, што, збіраючы подпісы, ініцыятыўная група ўжо можа весці агітацыю. Афіцыйная агітацыйная кампанія пачынаецца пасля рэгістрацыі, але ж ніхто не забараняе агітаваць за свайго вылучэнца. Таму я раіў бы ўсім, хто мае намер вылучацца ў кандыдаты, хто рэальна хоча выбірацца, вылучацца менавіта шляхам збору подпісаў», — сказаў Мікалай Лазавік.

У той жа час на нарадзе ў Мінгарвыканкаме па пытаннях арганізацыі і правядзення выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў **старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія ЯРМОШЫНА** заявіла, што на імідж выбараў вельмі дрэнна ўплываюць недакладныя спісы выбаршчыкаў.

— На жаль, як паказвае практыка папярэдніх кампаній, у спісах грамадзян, якія маюць права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў, дубліруюцца ранейшыя памылкі, — сказала Лідзія Ярмошына. — Грамадзяне, не ўключаныя ў спісы на папярэдніх выбарах і ўключаныя ў дадатковыя спісы, не фігуруюць у новых спісах. І гэта прыводзіць да скандалаў, выклікае шмат скаргаў, а таксама нежаданне людзей ісці на выбарчыя ўчасткі. «Я пастаянна прашу прабачэння ў грамадзян за недакладнасць у спісах выбаршчыкаў. Усе чамусьці лічаць, што са спісамі робяцца нейкія маніпуляцыі», — дадала яна.

Старшыня ЦВК асаблівую ўвагу звярнула на неабходнасць паўнаты і дакладнасці спісаў. Пры гэтым, падкрэсліла Лідзія Ярмошына, нельга выкарыстоўваць спісы выбаршчыкаў, што былі на парламенцкіх выбарах, паколькі ў іх не былі ўнесены грамадзяне Расійскай Федэрацыі, якія маюць пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі і маюць права ўдзелу ў выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

■ Гандаль

БЕЛАРУСЫ ЎПАДАБАЛІ ШОПІНГ

Беларусы сустрэлі Новы год весела і смачна. За апошнія месяцы 2013 года было пастаўлена 5,6 мільёна бутэлек шампанскага, а кандытарскія фабрыкі адгрузілі 1,7 мільёна «салодкіх» навагодніх падарункаў. З 20 снежня ў аб'ектах грамадскага харчавання сталіцы штодзённа святкавалі Каляды і Новы год 20 тысяч наведвальнікаў. Такія лічбы прадаставіла Міністэрства гандлю, прэзентуючы папярэднія вынікі леташняй працы ведамства, у тым ліку арганізацый гандлю ў святочныя дні.

Гандлююць усе!

Вядомы вынікі і першага ў краіне адзінага дня зніжак, які прайшоў 29 снежня 2013 года. У гэты дзень крамы прапаноўвалі пакупнікам тавары са зніжкай у памеры 15-20% ад дзеючай цаны. Падчас акцыі колькасць пакупнікоў павялічылася больш чым у 2-3 разы ў параўнанні са звычайнай нядзеляй. А рознічны тавараабарот вырас у сярэднім па арганізацыях больш чым у 3 разы.

Аднак і без усялякіх акцый беларусы куплялі нядрэнна. «Гандаль забяспечыў найвялікшы ўклад з усіх галін у ВУП краіны. Без яго ВУП быў бы, хутчэй за ўсё, адмоўным», — заявіў Артур Карповіч, першы намеснік міністра гандлю. Доля гандлю ў ВУП склала 12,6%. У студзені—лістападзе 2013 года было забяспечана павелічэнне аб'ёмаў рэалізацыі практычна па ўсіх харчовых і нехарчовых таварах — 112,2% і 126,6% адпаведна да аналагічнага леташняга перыяду. Пры гэтым назіралася станоўчая дынаміка долі продажаў айчынных тавараў (рост з 70,9% да 71,7% ад рознічнага тавараабароту). Адбылося гэта ўсё, па словах Артура Карповіча, «на фоне нарастаючай жорсткай канкурэнцыі, у тым ліку ў межах Мытнага саюза».

Не дзіўна тады, што Міністэрства гандлю прыцягнула ў 2013 годзе прамыя замежныя інвестыцыі прыкладна на 300 млн долараў (другое месца пасля прамысловасці — 534,6 млн). Пры гэтым на пачатку года меркавалася, што гэтая лічба будзе ўдвая меншай. «Сёння ў гандлёвую сферу ахвотна ідуць замежныя інвестыцыі», — адзначыў Артур Карповіч. Паводле яго слоў, замежныя інвестыцыі ідуць перш за ўсё ў будаўніцтва гандлёвых комплексаў і аб'ектаў. Так, колькасць магазінаў павялічылася на 1043, гандлёвых цэнтраў — на 17.

Звяртайце ўвагу на тэрмін прыдатнасці

Асаблівая ўвага ў другой палове 2013 года надавалася міністэрствам парадку на спажывецкім рынку, у тым ліку ў сеткавых крамах. «Па выніках планавых і няпланавых праверак больш чым 1300 аб'ектаў, парушэнні, на жаль, устаноўлены амаль у кожным (96%). Напрыклад, вынікі кантрольных мерапрыемстваў у крамах сеткі «Еўраопт» паказваюць, што ў кожным трэцім гандлёвым аб'екце з ліку праверэных рэалізоўваўся пратэрміраваны тавар. У крамах сеткі «Рублёўскі» ўстаноўлена, што ў 80% гандлёвых аб'ектаў рэалізоўваўся тавар са скончаным тэрмінам прыдатнасці. Не лепш справы і ў фірменных крамах птушкафабрык. У 25 крамах з 29 праверэных знаходзіўся пратэрміраваны тавар. Гэта крамы ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка», РУП «Беларуснафта», ААТ «1-я Мінская птушкафабрыка» і іншыя», — пералічыў парушальнікаў першы намеснік міністра. Але тут жа зрабіў агаворку: «Але гэта не значыць, што нельга хадзіць у крамы. Гэта толькі адзінкавыя выпадкі, і іх становіцца ўсё менш. Проста заўсёды правярайце тэрмін прыдатнасці. А пра ўсе парушэнні можна паведаміць па спецыяльным «тэлефоне даверу» Мінгандлю — 200-92-02. Усе недахопы і прапановы па працы аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва любы ахвотны можа выказаць абсалютна ананімна. Кожны падобны зварот улічваецца пры назначэнні і правядзенні праверак».

Усе недахопы і прапановы па працы аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва любы ахвотны можа выказаць абсалютна ананімна па «тэлефоне даверу» Мінгандлю — 200-92-02.

Між іншым, найбольш распаўсюджаныя парушэнні (акрамя наяўнасці пратэрмінаванай прадукцыі) — гэта невыкананне асартыментных пералікаў, адсутнасць інфармацыі аб вытворцах, даце вырабу, умовах і тэрміне захоўвання, невыкананне парадку афармлення цэннікаў, адсутнасць кантрольных вагаў, невыкананне рэжыму працы і гэтак далей. Былі складзены 902 пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях, па якіх прадугледжваецца прымяненне штрафаў на суму звыш 6 млрд рублёў.

Рэкламы! Больш рэкламы!

Міністэрства гандлю вельмі хвалюе рэкламаванне айчынных тавараў. «Цяпер міністэрствам распрацоўваецца праект Канцэпцыі развіцця рэкламнага рынку Беларусі на 2014—2020 гады, дзе прадугледжаны мерапрыемствы па нарошчванні аб'ёмаў рэкламы айчынных вытворцаў, — паведаміў Артур Карповіч. — Апошнім часам яны і так павялічваюць выдаткі на рэкламу прадукцыі, разумеючы, што рэклама — гэта рухавік гандлю. За 9 месяцаў 2013 года айчынныя вытворцы і прадпрыемствы гандлю ў цэлым выдаткавалі на рэкламу 609 млрд рублёў, што на 216 мільярдаў перавышае паказчык за аналагічны перыяд 2012 года. Аднак калі харчовая прамысловасць і гандаль павялічылі выдаткі на рэкламу амаль у 2 разы, то для тэкстыльнай, швейнай, дрэваапрацоўчай прамысловасці гэта не характэрна».

На ЧС-2014 будуць прадавацца і беларускія сувеніры

«Падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі-2014 да продажу будуць дапушчаны 26 найменняў і 87 разнавіднасцяў тавараў беларускай вытворчасці з сімволікай чэмпіянату», —заявіла Ніна Пашко, начальнік упраўлення спажывецкага рынку нехарчовых тавараў Міністэрства гандлю. Гэта календары на тэкстыльнай аснове, сшыткі, альбомы для малявання, драўляныя скрыначкі, масленіцы, мыла, камплекты для саўны, лазні. Іх рэалізацыя абмяжоўваецца толькі ў фан-зонах і спартыўных арэнах. Як паведамлялася раней, Міжнародная федэрацыя хакея заключыла кантракт са шведскай фірмай, якая стане эксклюзіўным вытворцам сувенірнай прадукцыі. Вызначаны пералік тавараў беларускіх вытворцаў з сімволікай (відарысам эмблемы і талісмана) чэмпіянату, якія да 9 лютага неабходна выключыць з продажу. Беларуская прадукцыя зможа вярнуцца на прылаўкі толькі 25 мая. Усяго забарона ўстаноўлена на рэалізацыю 56 найменняў і 188 разнавіднасцяў нехарчовых тавараў.

Tax-free працуе

Летась наша краіна першай сярод дзяржаў СНД укараніла сістэму вяртання падатку на дабаўленую вартасць Tax-free. Аднымі з першых да яе падключыліся буйныя ўнівермагі сталіцы «ГУМ», «ЦУМ», «Беларусь», «ГД «На Нямізе». Гэтай паслугай ужо скарысталіся больш за 200 замежнікаў з 42 краін — Германіі, Кітая, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Эквадора, ЗША, Ізраіля, Італіі, Нарвегіі, Турцыі і іншых. Агульная сума афармленых чэкаў Tax-free на 4 студзеня склала 620 млн беларускіх рублёў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

■ Ваш кашалёк

ЯК ЗМЯНЯЛІСЯ ЦЭНЫ Ў 2013-м

Цэны на харчовыя тавары ў Беларусі ў снежні 2013 года выраслі на 2,2 працэнта ў параўнанні з лістападам, адносна снежня 2012-га яны павялічыліся на 13,4 працэнта. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У снежні ў параўнанні з папярэднім месяцам зноў патаннеў алей — на 1,3 працэнта. Цана на цукар чарговы раз засталася на былым узроўні.

Менш чым на 1 працэнт падаражэлі каўбасныя вырабы і вэнджаніна (на 0,4 працэнта), алкагольныя напіткі (на 0,7 працэнта). Больш за ўсё ў снежні мінулага года падаражэла агародніна — на 15,7 працэнта, бульба — на 11,3 працэнта, пшанічная мука — на 7,8 працэнта, а таксама яйкі — на 6,3 працэнта.

Цэны на нехарчовыя тавары ў снежні ў параўнанні з лістападам павялічыліся на 0,8 працэнта, са снежнем 2012 года — на 7,6 працэнта. У гэтай групе тавараў не адбылося вялікіх змяненняў цэн. Бензін падаражэў на 4,6 працэнта, веласіпеды і матацыклы — на 1,4 працэнта. На 1 працэнт выраслі цэны на медыкаменты. На астатнія тавары падаражанне склала менш чым 1 працэнт.

Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў снежні ў параўнанні з лістападам склаў 104,9 працэнта, са снежнем 2012 года — 139,1 працэнта. Цэны на паслугі сувязі павялічыліся на 0,9 працэнта, на медыцынскія паслугі — на 1,3 працэнта, турыстычныя — на 2,4 працэнта, паслугі культуры — на 2,8 працэнта. Бытавыя паслугі падаражэлі на 3,1 працэнта, санаторна-аздараўленчыя — на 3,9 працэнта. Цэны на жыллёва-камунальныя паслугі выраслі на 8,1 працэнта. Паслугі пасажырскага транспарту сталі даражэйшымі на 14 працэнтаў. Не змяніўся кошт паслуг вышэйшай адукацыі, а таксама паслуг дашкольных устаноў.

У цэлым у Беларусі індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў снежні 2013 года ў адносінах да лістапада склаў 102,4 працэнта, да снежня 2012-га — 116,5 працэнта. У студзені 2013 года цэны выраслі на 3 працэнты, у лютым — на 1,2 працэнта, сакавіку — на 1,1 працэнта, красавіку — на 0,5 працэнта, маі — на 0,7 працэнта, чэрвені — на 0,3 працэнта, ліпені — на 1 працэнт, жніўні — на 0,1 працэнта, верасні — на 1,7 працэнта, у кастрычніку — 1,9, у лістападзе — 1,6 працэнта.

■

■ Навіны сталіцы

У Мінску з'явілася вуліца Агінскага

Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў рашэнне аб прысваенні найменняў шэрагу састаўных частак сталіцы. Адпаведнае рашэнне № 386 ад 23 снежня 2013 года апублікавана ўчора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе БЕЛТА.

Так, вырашана прысвоіць парку ў межах вуліц Каменнагорскай, Лідскай, Калеснікава, Казіміраўскай найменне парк імя Уга Чавеса.

Акрамя таго, у мікрараёне Магістр замест праектуемай вуліцы № 1 з'явіцца вуліца Агінскага, праектуемай вуліцы № 2 ад праектуемай вуліцы № 1 да вуліцы Кірылы Тураўскага — вуліца Ільі Капіевіча. Праектуемая вуліца № 3 будзе называцца вуліцай Акадэміка Высоцкага. У гэтым жа мікрараёне праезд ад праспекта Незалежнасці да праезду перад лесапаркавай зонай стане праездам Універсітэцкім. Праезд № 3 будзе называцца вуліца Навуковая.

У мікрараёне Сокал праектуемая вуліца № 13 будзе называцца вуліцай Антоненкі, праектуемыя вуліцы № 15 і № 16 аб'ядналі ў вуліцу Дакутовіч, праектуемая вуліца № 17 стане вуліцай Шацілы, праектуемая вуліца № 7 у межах вуліц Малы Трасцянец і Зарэчная — вуліцай Дукорскай.

■

«ТОЕ, ЯК МЯНЕ ТУТ ПРЫМАЮЦЬ, ПЕРАСЯГНУЛА ЎСЕ МАЕ ЧАКАННІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мітрапаліт Філарэт за свае архіпастырскія гады вырасціў тут добры духоўны вінаградник. Таму мая задача — працягваць клапаціцца пра гэты вінаградник, акармляць яго. Будзем спадзявацца, што ўладыка Філарэт, калі аправіцца ад сваёй хваробы, будзе мне добрым памочнікам, пра што мы заўсёды молімся.

«Я шчыра радуюся таму, што сёння нашы праваслаўныя храмы напаўняюцца і дзеткамі, і дарослымі, і нават казакі сёння з намі моляцца ў гэтым храме. Мне хочацца, каб гэтак жа, як сёння, і кожны дзень у будучым нашы храмы напаўняліся, і нашы людзі станавіліся поўнымі пашаны да Бога праваслаўнымі хрысціянамі.

Мы сёння маліліся за Уладыку Філарэта, і я ўсіх вас прашу таксама ўзносіць свае малітвы і дома, і ў храме, бо для кожнага з нас Уладыка Філарэт — добры настаўнік, малітоўнік... чалавек, які жыве з малітвай...

Для мяне Уладыка Філарэт з'яўляецца духоўным настаўнікам, бо на працягу многіх гадоў я нёс паслушэнства пад яго кіраўніцтвам у рускай духоўнай місіі ў Іерусаліме, калі ён быў кіраўніком аддзела знешніх царкоўных зносін. Мы ўсе яго ведаем як аднаго з самых шаноўных архіпастыраў у Рускай праваслаўнай царкве, таму хочацца пажадаць, каб яшчэ доўгія гады ён быў нашым паплечнікам, каб усім нам дапамагаў сваім словам, падтрымкай і мудрасцю, якой Гасподзь надзяліў яго асабліва.

...У гэтыя святочныя дні я ва ўсіх храмах, дзе служу, усім перадаю патрыяршае благаславенне. Свяцейшы Патрыярх Кірыл, калі даваў наказ мне на новае служэнне ў Рэспубліцы Беларусь, казаў: «Уладыка, я вельмі люблю Беларусь, вельмі люблю народ Беларусі і ўпэўнены, і вы палюбіце гэты набожны добры народ. Шматпакутны народ, які многа пацярпеў, але захаваў веру ў Бога».

«Уладыка, — казаў ён мне, — вы едзеце ў добрую краіну, якая працвітае і дзе пражываюць годныя людзі». І я ўжо сапраўды ў гэтым упэўніўся і радуюся таму, што звяртаюся з вамі, і буду спадзявацца, што Гасподзь благаславіць усіх нас і мы будзем доўгія гады разам маліцца, працаваць, бачыць адно аднаго і жадаць адно аднаму толькі добрае і вечнае.

І карыстаючыся магчымасцю, хачу яшчэ раз усім пажадаць, каб новы каляндарны год, які наступіў, для кожнага з нас быў годам блаславенным, мірным, каб Гасподзь усіх нас благаслаўляў добрым здароўем». ***(З пропаведзі мітрапаліта Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі ў сталічным прыходзе іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» 10 студзеня 2014 года).***

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Гэтыя 10 дзён сапраўды былі вельмі насычаныя для новага Экзарха. Ён прыляцеў у Мінск 4 студзеня і ўжо ў гэты дзень узначаліў малебен у галоўным праваслаўным храме сталіцы, наведаў Духоўна-адукацыйны цэнтр Беларускай праваслаўнай царквы, Епархіяльнае ўпраўленне. Для сваёй рэзідэнцыі Патрыяршы Экзарх абраў Мітрапаліцкую гасціную пры Доме міласэрнасці.

На наступны дзень, 5 студзеня 2014 года, мітрапаліт Павел здзейсніў у Свята-Кафедральным саборы сваю першую літургію на Беларусі. У другой палове дня ён сустрэўся з епіскапатам. Шостага студзеня прадстаяцель пасля навячэр'я і літургіі наведаў у бальніцы мітрапаліта Філарэта, увечары ўзначаліў усяночнае трыванне. У сам дзень Раства Хрыстовага Уладыка Павел зноў узначаліў святочную літургію ў кафедральным саборы, потым — сустрэча з кіраўніком дзяржавы, увечары — святочнае набажэнства. За гэтыя дні ён здзяйсняў урачыстыя літургіі ў сталічных Свята-Аляксандра-Неўскім храме, Ефрасіннеўскім храме прыхода іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць», Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы, Успенскім саборы Жыровіцкага манастыра і Міхайлаўскім кафедральным саборы Слуцка. Мітрапаліт Павел віншаваў дзяцей на галоўнай дзіцячай ёлцы краіны, удзельнічаў у цырымоніі ўзнагароджання дзяржаўнай прэміяй «За духоўнае адраджэнне», віншаваў з Раством работнікаў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення і яшчэ раз наведаў свайго папярэдніка мітрапаліта Філарэта, за здароўе якога ён падчас кожнага набажэнства просіць вернікаў памаліцца асобна. І пасля кожнага набажэнства падчас цалавання крыжа Патрыяршы Экзарх адорвае дзяцей прасфорамі і шакаладкамі.

Калі ў Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы нейкая жанчына падчас цалавання крыжа сказала, што ў яе сёння дзень нараджэння, мітрапаліт Павел спачатку гучна спытаў прыхаджан, ці ёсць яшчэ імяніннікі ў храме, прапанаваў усім спець у гонар імяніннікі «Доўгая лета» і падарыў шчаслівай жанчыне букет кветак...

■ Цікава

ЗЯМЛЮ НАКРЫЕ МЕТЭАРЫТНЫ «СНЕГ» КАМЕТЫ ISON

У ноч на 14 студзеня да Зямлі даляціць касмічны пыл ад мегакаметы «Айсон» (ISON), якая распалася ў снежні, наблізіўшыся да Сонца. Рэдкая з'ява ў атмасферы Зямлі чакаецца сёння і ў бліжэйшыя некалькі дзён, паведамляюць інфармагенцтвы.

Нагадаю, што летась камета Айсон разляцелася на часткі з-за збліжэння з Сонцам. Мільёны тон рэчыва апынуліся ў касмічнай прасторы, і цяпер частка гэтага касмічнага смецця знаходзіцца на шляху Зямлі. Зрэшты, паводле сцвярджэнняў астраномаў, прыгожага відовішча не будзе, бо драбнюткія часціцы будуць проста плаўна апускацца на Зямлю ў атмасферы планеты, пакуль не дасягнуць яе паверхні. Але гэты «снег» з рэшткаў каметы ўсё ж можа стварыць над планетай цікавыя з'явы — напрыклад, серабрыстыя аблокі або рабізну, якія хутчэй за ўсё можна будзе ўбачыць над полюсамі Зямлі.

А тым часам астраномы ва ўсім свеце назіраюць за каметай Лаўджоя, якая праходзіць паблізу ад Зямлі толькі раз у 7000 гадоў. Камету асабліва добра відаць ва ўсходняй частцы неба ў ранішні час. Касмічная падарожніца адрозніваецца сваёй унікальнай зялёнай афарбоўкай. Яна мае незвычайна доўгі хвост. Зялёны арэол вакол каметы абумоўлены выпарэннем вады з яе паверхні пры раставанні нябеснага цела ад уздзеяння Сонца.

Сяргей КУРКАЧ.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

УНП 600013173

ОАО «Минскоблхлебопродукт»

извещает, что 24 января 2014 года
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 4. Начало собрания в 13.00.
Регистрация акционеров с 12.30.

При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера паспорт и доверенность.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

О даче согласия на увеличение доли Республики Беларусь в уставном фонде открытого акционерного общества «Минскоблхлебопродукт».

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт». *Тел. 224-19-17.*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

СМАРТ-ТЭХНАЛОГІІ Ў ТРАМВАІ

З 1 лютага пасажыры сталічных трамваяў пакінуць у мінулым звыклыя папяровыя праязныя. Іх заменяць спецыяльныя электронныя праязныя на аснове бескантактных смарт-картак.

Па інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», набыць новыя праязныя можна будзе ўжо з 15 студзеня. У продаж паступяць карткі з тэрмінам дзеяння 10, 15 дзён і 1 месяц.

Пры ўваходзе ў трамвай уладальнік смарт-карткі павінен прыкласці яе да валідатара (спецыяльнае прыстасаванне, прымацаванае на парэнчах). Адразу пачуецца гукавы сігнал, які азначае, што праезд аплачаны. Калі ў транспарт зойдуць кантралёры, і валідатары, і электронныя кампосцеры, з дапамогай якіх пасажыры трамваяў цяпер павінны прабіваць аднаразовыя талоны, будуць адразу блакіравацца. Падчас пакупкі новага праязнога ў першы раз давядзецца аддаць дадатковых 12 тысяч рублёў — гэта залогавы кошт карткі. Пакуль што праязны на яе аснове не сумяшчае ў сабе права праезду на некалькіх відах транспарту, абмяжоўваючыся толькі трамваем, але, як паведамляюць у «Мінсктрансе», у пачатку вясны электронныя кампосцеры і валідатары павінны з'явіцца ва ўсіх гарадскіх аўтобусах і тралейбусах.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

СУСТРЭНЕМСЯ НА «ВІЦЕБСКАЙ СНЯЖЫНЦЫ»

Танцавальныя пары з Беларусі, а таксама краін блізкага і далёкага замежжа возьмуць удзел у XXIX Міжнародным конкурсе па спартыўных бальных танцах «Віцебская сняжынка». Свята танца адбудзецца 18-19 студзеня ў канцэртнай зале «Віцебск».

— Гэты беларускі конкурс сусветнай класіфікацыі WDSF сярод прафесіяналаў лічыцца адным з самых прэстыжных у свеце. Удзельнікі выступяць у васьмі узроставых катэгорыях: як маленькія танцоры ва ўзросце ад 5 гадоў, так і вопытныя пары, у тым ліку і міжнароднага ўзроўню майстэрства. Кожная пара прадставіць па дзве танцавальныя праграмы — еўрапейскую і лацінаамерыканскую.

Для ацэнкі выступленняў канкурсантаў запрошаны суддзі з Азербайджана, Беларусі, Іспаніі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Славеніі, Расіі, Турцыі, Украіны, Фінляндыі, Швейцарыі, Эстоніі, — паведамілі ў арганізацыйным камітэце конкурсу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕНАЎМЫСНЫ СУІЦЫД

У Магілёве міліцыянеры вярнулі мужчыну... з таго свету.

Спачатку ўсё было звычайна: спрацавала ахоўная сігналізацыя на адным з аб'ектаў гаражнага масіву «Хімвалакно-2» і супрацоўнікі Кастрычніцкага (г. Магілёва) аддзела Дэпартамента аховы ў складзе прапаршчыка Андрэя Кісялёва і малодшага сяржанта Дзмітрыя Кузняцова выехалі на праверку. А далей сюжэт разгортваўся як у сапраўдным дэтэктыве.

Як паведаміў старшы інспектар Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС маёр міліцыі Яўген Паўлюк, на месцы міліцыянеры ўбачылі, што дзверы гаража прыадчынены. Калі яны заглянулі ўнутр, то заўважылі мужчыну, які вісеў на вяроўцы і не падаваў ніякіх прыкмет жыцця. Але супрацоўнікі аддзела аховы не разгубіліся і кінуліся ратаваць «мерцвяка» шляхам правядзення закрытага масажу сэрца і штучнага дыхання. Іх намаганні мелі поспех. Малады чалавек, які ледзьве не скончыў свой жыццёвы шлях у 30 гадоў, потым прызнаўся, што зусім не збіраўся накладаць на сябе рукі. У гараж прыйшоў, каб прывесці ў парадак нейкія звычайныя справы, а калі іх скончыў і нават паставіў гараж на сігналізацыю, неадкуль прыйшло жахлівае жаданне сысці з жыцця. Сігналізацыя аказалася тым самым ратавальным сродкам, на які ён нават і не разлічваў. Але, калі б не рашучыя дзеянні неабыякавых міліцыянераў, усё магло скончыцца не так аптымістычна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

СТАНУЦЬ УДВАЯ БОЛЬШ ШЧАСЛІВЫМІ

У Полацкім раёне будучыя муж і жонка ў гэтыя дні маюць магчымасць стаць удвая больш шчаслівымі.

— Да 19 студзеня 2014 года ў аддзеле ЗАГС Полацкага райвыканкама будзе праходзіць акцыя «Хто дорыць шчасце — шчаслівы ўдвая больш». Пры падачы маладымі пашпартоў за тыдзень да афіцыйнай рэгістрацыі шлюбу ў аддзеле ЗАГС Полацкага райвыканкама ім прапануюць паўдзельнічаць у навагодняй дабрачыннай акцыі. Маладыя ва ўрачысты дзень рэгістрацыі маюць магчымасць падзяліцца сваім шчасцем і падарыць малазабяспечанай сям'і навагодні падарунак пад навагоднюю ёлку са сваімі пажаданнямі. Сям'я, якой будзе ўручаны падарунак, выбіраецца будучымі мужам і жонкай шляхам латарэі (на ёлачных шарах напісаны прозвішчы бацькоў, імёны і ўзрост дзяцей, адрас пражывання. — **Аўт.**), — паведамілі ў Полацкім райвыканкаме.

Пасля завяршэння акцыі арганізатары — «Беларускі саюз жанчын» сумесна з аддзелам ЗАГС, камісіяй па справах непаўналетніх Полацкага райвыканкама — запросяць малазабяспечаныя сем'і на гарбату. Кожнай будуць уручаны адрасаваныя ім навагоднія падарункі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«МАЗ» СПЫНІЎ ДОМ

У Віцебску «МАЗ» урэзаўся ў шматкватэрны жылы дом.

— Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося ў абласным цэнтры а дзявятай гадзіне раніцы на вуліцы Розы Люксембург. Вадзіцель грузавіка не справіўся з кіраваннем, аўтамабіль сутыкнуўся з пяціпавярховым жылым домам. Будынак не пашкоджаны, сярод жыхароў пацярпелых няма, — паведаміла Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

Вадзіцеля «МАЗ» выратавальнікі выцягнулі з кабіны. Пацярпелага, які атрымаў траўмы, шпіталізавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПЕНСІЯНЕР ПАВІС УНІЗ ГАЛАВОЙ

У Смалявіцкім раёне выратавальнікі знялі з апоры лініі электраперадач пенсіянера.

— Удзень пра тое, што на апоры паблізу вёскі Ізбіцкае ўніз галавой вісіць чалавек, якому патрэбна дапамога, паведаміў выпадковы сведка, — распавялі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — На месцы з вышыні чатырох метраў пры дапамозе лесвіцы нашы работнікі знялі мужчыну 1950 года нараджэння. Мяркуецца, што пенсіянер быў нападпітку. Падчас высвятлення абставін здарэння было ўстаноўлена, што мужчына спрабаваў самастойна ачысціць электрычныя правады, якія акісліліся, заблытаўся ў дроце, не ўтрымаўся і павіс уніз галавой на апоры. Не дачакаўшыся брыгады хуткай медыцынскай дапамогі, пацярпелы з'ехаў з месца здарэння са знаёмым.

Сяргей РАСОЛЬКА.

В суд Речицкого района поступило заявление об объявлении умершим гражданина КОПУСОВА Сергея Антоновича, 7.05.1959 года рождения, уроженца г. Речица Гомельской области, проживавшего по адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. Сенькина, д. 7, кв. 37, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить суду Речицкого района в течение двух месяцев после публикации имеющиеся сведения о Копусове Сергее Антоновиче.